Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 КРАСАВІКА 2014 г. СУБОТА № 73 (27683) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## АДЗІНСТВА ДУХУ І З'ЯДНАНАСЦЬ

*Хрысціянам Беларусі*

*Дарагія суайчыннікі!*

*Са светлым Хрыстовым Уваскрэсеннем!*

*Вялікдзень — не проста свята, гэта сутнасць хрысціянства. Ён увасабляе ў сабе найважнейшыя чалавечыя дабрадзейнасці — міласэрнасць, узаемаразуменне і ўсёдараванне. Уваскрэсенне Хрыстова сімвалізуе перамогу праўды і высокіх маральных ідэалаў, надае жыццю вечны сэнс, усяляе веру ў будучыню.*

*У цудоўныя дні велікодных урачыстасцяў абуджаецца ўсё навокал, у сэрцах людзей пануюць радасць і любоў, умацоўваецца жаданне зноў і зноў рабіць добрыя справы.*

*Глыбока сімвалічна, што ў гэтым годзе Вялікдзень сустракаюць адначасова паслядоўнікі ўсіх хрысціянскіх цэркваў. Сёння нам, як ніколі раней, неабходны адзінства духу і з'яднанасць. Толькі сумеснымі намаганнямі ўсіх грамадзян краіны мы зможам зберагчы згоду і мір на роднай зямлі.*

*Няхай радасць велікоднага свята напоўніць кожны дом, кожную сям'ю святлом, дабрынёй і надзеяй. І няхай ніякія выпрабаванні не разбураць наш унутраны духоўны лад і знешняе светаўладкаванне.*

*Моцнага вам здароўя, дабрабыту і вясенняга настрою.*

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## АД КАРАНЁЎ РАСЦЕ ЎСЁ ДРЭВА

### Увага да захавання аб'ектаў культурнай спадчыны спрыяе ўмацаванню дзяржаўнасці

**Такі пункт гледжання выказаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з генеральным дырэктарам ЮНЕСКА Ірынай Бокавай, паведамляе БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на важнасць захавання аб'ектаў культурнай спадчыны. «Для нас вельмі важна знайсці ў нашым мінулым тое, што звязвае нас з сучаснасцю. Мы не хацелі б забываць, адкуль мы родам, таму вялікую ўвагу надаём гэтым аб'ектам. Тым больш што яны спрыяюць умацаванню нашай дзяржаўнасці і лішні раз даказваюць, што Беларусь — старажытная зямля, розныя дзяржавы тут былі, па-рознаму складваўся лёс. Але сёння ёсць Беларусь — самастойная незалежная дзяржава, карані якой сыходзяць у мінулае», — сказаў ён. Прэзідэнт падкрэсліў, што тое, чым займаецца ЮНЕСКА, вельмі сімвалічна і важна. Ён адзначыў, што Беларусі ёсць што сказаць у сувязі з 60-годдзем членства ў ЮНЕСКА, асабліва ў сферах адукацыі і навукі. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што 5% ВУП краіны траціцца на адукацыю. Не так даўно адбылася сустрэча Прэзідэнта з навукоўцамі, дзе гаворка ішла пра прыярытэты беларускай навукі на далёкую і на сярэднетэрміновую перспектывы. Што тычыцца культуры, то, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Ірына Бокава сама зможа ўбачыць знакавыя аб'екты ў Беларусі, у тым ліку ўнесеныя ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Прэзідэнт падзякаваў генеральнаму дырэктару ЮНЕСКА за візіт, адзначыўшы: «Вы заўсёды можаце на нас разлічваць у арганізацыі — мы заўжды будзем падтрымліваць вашы ініцыятывы. Тым больш што яны вельмі патрэбныя і выгадныя не толькі нам, але і ўсяму чалавецтву».

У сваю чаргу, Ірына Бокава падкрэсліла, што ЮНЕСКА і ў далейшым будзе супрацоўнічаць з Беларуссю па ўсім спектры кірункаў і працягне працу па захаванні беларускай культурнай спадчыны.

# «НА БЕЛАРУСІ БОГ ЖЫВЕ — І НЯХАЙ ДАВЕКУ ЖЫВЕ»



ЗАЎТРА ХРЫСЦІЯНЕ РАЗАМ АДЗНАЧАЮЦЬ НАЙВЯЛІКШАЕ СВЯТА — УВАСКРАСЕННЕ ХРЫСТОВА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ЦЫТАТА ДНЯ




**Ірына БОКАВА, генеральны дырэктар ЮНЕСКА:**

***«Без культуры не можа быць ні квітнеючага грамадства, ні ўстойлівага развіцця. У сувязі з гэтым ЮНЕСКА супрацоўнічае з Беларуссю ў сферы аховы культурнай спадчыны чалавецтва, якая з'яўляецца асновай самабытнасці і самаідэнтыфікацыі народа. Яшчэ 11 аб'ектаў у Беларусі могуць быць уключаны ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. У так званым папярэднім спісе лічацца Аўгустоўскі канал (Гродзенская вобласць), Спаса-Праабражэнская царква і Сафійскі сабор (Полацк), Камянецкая вежа, Барысаглебская царква (Гродна), Свята-Мікольскі жаночы манастыр (Магілёў), Брэсцкая крэпасць, палацава-паркавы ансамбль Румянцавых-Паскевічаў (Гомель), культавыя збудаванні абароннага тыпу ў Беларусі, Польшчы і Літве (Мінская і Брэсцкая вобласці), архітэктурны ансамбль праспекта Незалежнасці ў Мінску, драўляныя цэрквы Палесся, Нацыянальны парк «Белавежская пушча» (пашырэнне). У папярэдні спіс унесены і аб'екты нематэрыяльнай культурнай спадчыны — калядная гульня «Жаніцьба Цярэшкі», абрады якой захаваліся ў вёсцы Аношкі Лепельскага раёна, і традыцыя шапавальства ў Дрыбіне».***

## АД КАЛІЙНАГА КАНФЛІКТУ НІХТО НЕ ВЫЙГРАЎ

### Аляксандр Лукашэнка прапануе «Уралкалію» вызначыцца, як дзейнічаць далей у інтарэсах кампаній і дзвюх краін

**Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на сустрэчы з намеснікам старшыні савета дырэктараў ААТ «Уралкалій», старшынёй савета дырэктараў ААТ «Аб'яднаная хімічная кампанія «Уралхім» Дзмітрыем Мазепіным, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.**

Аляксандр Лукашэнка прыняў Дзмітрыя Мазепіна па яго просьбе, адзначыўшы: «Вельмі знакава тое, што вы прыехалі да нас для абмеркавання праблем, якія яшчэ існуюць сёння, напэўна, у адносінах паміж нашымі кампаніямі, можа быць, нават і паміж дзяржавамі нейкі асадак застаўся».

СТАР. 2

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**22 красавіка 2014 года** ў 16.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца чарговае пасяджэнне чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

**«Прамая лінія»**

## ДА ЎВАГІ ПАЛЯЎНІЧЫХ І РЫБАЛОВАЎ!

26 чэрвеня ўступае ў сілу новая рэдакцыя правілаў вядзення палявання і рыбалоўства. Ці можна цяпер будзе зарэгістраваць паляўнічага сабаку без радаслоўнай? Якія дакументы патрэбны, каб займацца такімі папулярнымі відамі рыбалкі, як тролінг і падводнае паляванне? Якія перавагі дае членства ў Беларускім таварыстве паляўнічых і рыбаловаў? Дзе і як максімальна выгадна набыць пуцёўкі на здабычу звера ці лоў рыбы? На гэтыя і іншыя пытанні падчас «прамой лініі» адкажа **старшыня Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» Юрый Іванавіч ШУМСКІ.** Задаць пытанні можна **22 красавіка з 12.00 да 13.00 гадзін** па тэлефонах: **80172871866, 80172871871.** Папярэднія пытанні можна пакінуць, патэлефанаваўшы па нумары 80172871872.



## ЖЫЦЬ ПАВОДЛЕ ПРАЎДЫ І ЗАПАВЕДЗЯЎ БОЖЫХ



### Велікоднае пасланне Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі архіпастырам, пастырам, дыяканам, манахам і міранам Беларускай Праваслаўнай Царквы

*Нябёсы дастойна няхай весяляцца, і зямля няхай радуецца,*
*і няхай святкуе ўвесь свет, бачны і нябачны,*
*бо паўстаў Хрыстос — радасць вечная.*

**Трапар 1-й песні Пасхальнага канона**

Дарагія і ўзлюбленыя ў Хрысце Уваскрэслым

Праасвяшчэнныя архіпастыры, пачэсныя прасвітары і дыяканы, набожныя інакі і інакіні, богалюбівая паства Беларускай Праваслаўнай Царквы, сардэчна віншую вас са святам свят — Пасхай Гасподняй!

У гэты выратавальны для свету, светлазарны дзень мы, як і ўсе папярэднія нам з часоў апостальскіх пакаленні хрысціян, зноў і зноў з невымоўнай падзякай Богу, якая выліваецца з сэрцаў нашых, з духоўнай радасцю вітаем адно аднаго Пасхальным воклічам:

Хрыстос уваскрэс!

Толькі два словы, але якая неверагодная ў іх сіла! Гэтыя два словы ўскалыхнулі ўвесь свет, разбурылі браму пекла дашчэнту і стварылі вялікую і непераможную Хрысціянскую Царкву, падаючы ўсім яе дзецям жывую веру, духоўна-маральныя евангельскія каштоўнасці і дабрадатныя духоўныя сілы, здольныя веруючага ў Хрыста чалавека ўзнесці на вышыню духоўнай дасканаласці.

У аснову нашай веры пакладзена гэтая светлая і радасная вестка — вестка пра Уваскрасенне Богачалавека, а разам з Ім — і пра ўваскрасенне чалавецтва. Без веры ва Уваскрэслага Хрыста няма хрысціянства!

СТАР. 3

## ПАСХА — АЖЫЎЛЯЛЬНЫ ГЛЫТОК СВЕЖАГА ПАВЕТРА



### Пастырскае пасланне Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Вялікдзень

«Хрыстус Уваскрос, сапраўды Уваскрос!»

Глыбокапаважаныя святары, кансэкраваныя асобы, дарагія вернікі, людзі добрай волі!

Гэтым пасхальным заклікам вітаю ўсіх вас у радаснае і збаўчае свята Уваскрэсення Езуса Хрыста, калі мы адзначаем перамогу нашага Збаўцы над грахом, смерцю і злым духам. Гэтае свята паўтараецца кожны год, і мы ўжо так моцна прызвычаіліся да яго, што нярэдка кажам, што гісторыю Уваскрэсення Хрыста даўно ведаем. Аднак на самой справе свята Пасхі — гэта не мінулая гісторыя. Яно заўсёды актуальнае і дае нам новую надзею нават насуперак надзеі.

Сёння ва ўсіх хрысціянскіх святынях — каталіцкіх, праваслаўных і пратэстанцкіх — гучыць радаснае «Аллелюя». Пасхальная радасць пранікае ў нас да глыбіні сэрцаў, бо таямніца Уваскрэсення з'яўляецца самай вялікай праўдай нашай веры, і вакол яе канцэнтруецца як жыццё Касцёла, так і нашае асабістае.

Пасха абвяшчае нам вельмі важнае пасланне, што ў Хрысце Укрыжаваным і Уваскрэслым любячы нас Бог прыносіць нам збаўленне і дае новую надзею. Уваскрэслы Езус не вызваляе нас ад зла павярхоўна і часова, але радыкальна. Мы ўсе, ахрышчаныя ў Езуса Хрыста, у смерць Ягоную хрысціліся, каб, як Ён уваскрос з памерлых, так і нам увайсці ў новае жыццё, — кажа святы апостал Павел (Рым 6, 3-4).

Хоць у Вялікую пятніцу здавалася, што Езус быў пераможаны і не засталося ніякай надзеі, аднак праўда Уваскрэсення сведчыць аб перамозе жыцця над смерцю, любові над нянавісцю, міласэрнасці над помстай. Такім чынам, пасхальная таямніца смерці і ўваскрэсення Хрыста кардынальна змяняе сітуацыю чалавека і свету. Таму ўваскрослы Езус — гэта не мінулае, але сучаснасць, дзякуючы якой змяняецца свет і чалавек.

СТАР. 3

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### НАТА ЎЗМАЦНЯЕ ПАЗІЦЫІ ВА УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

Краіны НАТА караблямі і знішчальнікамі ўзмацняюць пазіцыі альянсу ва Усходняй Еўропе, перадаюць інфармагенцтвы. НАТА адпраўляе пяць караблёў у Балтыйскае мора для актывізацыі абароны сваіх усходнееўрапейскіх саюзнікаў, гаворыцца ў заяве альянсу. Марская група будзе складацца з караблёў Нарвегіі, Нідэрландаў, Бельгіі і Эстоніі — гэта чатыры мінныя тральшчыкі і адно судна забеспячэння. Яны складаюць адну з чатырох ваенна-марскіх груп сіл хуткага рэагавання НАТА. Таксама стала вядома, што чатыры знішчальнікі ВПС Францыі адправяцца да канца красавіка на патруляванне паветранай прасторы над краінамі Балтыі. У пачатку красавіка Францыя ўжо адправіла чатыры знішчальнікі для патрулявання неба над Польшчай. Акрамя таго, было заяўлена, што кантроль за паветранай прасторай Польшчы і Румыніі з пачатку красавіка ажыццяўляе самалёт далёкага назірання AWACS. Напярэдадні прэм'ер-міністр Канады Стывен Харпер паведаміў, што яго краіна таксама накіруе ў Польшчу шэсць знішчальнікаў CF-18 у рамках узмацнення місіі паветранай паліцыі НАТА. Канадскія знішчальнікі будуць патруляваць паветраную прастору над краінамі Усходняй Еўропы разам са знішчальнікамі ЗША, Вялікабрытаніі, Даніі, Польшчы, Партугаліі і Германіі.



### ПАЛКОЎНІК БОЛЬШ НЕ ПІША...

У Мексіцы на 88-м годзе жыцця памёр пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры, калумбійскі майстар «магічнага рэалізму» Габрыэль Гарсія Маркес. Маркес пайшоў з жыцця ў сваёй рэзідэнцыі ў Мехіка, піша El Pais. Жалобны рытуал у прысутнасці публікі перад крэмацыяй цела Гарсія Маркеса не запланаваны. Пісьменнік шырока вядомы не толькі ў Лацінскай Амерыцы, але і далёка за яе межамі. У 1982 годзе Маркесу была прысуджана Нобелеўская прэмія па літаратуры «За раманы і апавяданні, у якіх фантазія і рэальнасць адлюстроўваюць жыццё і канфлікты цэлага кантынента», пасля чаго ён стаў шырока папулярны ва ўсім свеце. Тут жа, у Мексіцы, Маркес напісаў свой самы вядомы твор — «Сто гадоў адзіноты». Першапачаткова раман ніхто не хацеў друкаваць. Пісьменнік разаслаў рукапіс у калумбійскія выдавецтвы, але ні адно з іх не адважылася выпусціць кнігу, напісаную ў прынцыпова новай манеры, якая з часам была названа «магічным рэалізмам». Пасля няўдалай спробы будучы лаўрэат Нобелеўскай прэміі адправіў рукапіс у Буэнас-Айрэс, галоўнаму рэдактару выдавецтва «Судамерыкана» Франсіска Паруа. Да кнігі ён прыклаў кароткі ліст: «Прачытай, калі не спадабаецца, то парві, і я забудуся пра гэты раман». Нават не дачытаўшы рукапіс да канца, Паруа адправіў яго ў друк. І не прагадаў: раман «Сто гадоў адзіноты» стаў самым папулярным творам за ўсю гісторыю лацінаамерыканскай літаратуры. Сярод другіх найбольш вядомых твораў Маркеса — «Восень патрыярха» і « Палкоўніку ніхто не піша».

ISSN 1990 - 763X

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ШЧАСЛІВЫ ШЛЮБ МОЖНА ВЫЛІЧЫЦЬ З ДАПАМОГАЙ... ЛІНЕЙКІ



Даведацца, наколькі шчаслівыя два чалавекі, якія жывуць разам, можна, проста назіраючы за тым, як яны спяць. Навукоўцы правялі даследаванне сярод шлюбных пар і ўстанавілі, што муж і жонка, якія спалі на адлегласці менш за сем сантыметраў адно ад аднаго, былі найбольш задаволены сваімі адносінамі. А тыя, хто спаў на адлегласці больш за 70 сантыметраў — больш за ўсё адносінамі незадаволены. Сярод пар, якія спалі «ўшчыльную» адно да аднаго, колькасць задаволеных адносінамі склала 86%, у той час, як сярод тых, хто аддаваў перавагу спаць на адлегласці, — толькі 66%. 42% сужэнцаў заявілі, што аддаюць перавагу спаць, лежачы спіна да спіны, 31% — лежачы ў адным кірунку і 4% — лежачы тварам адно да аднаго. Акрамя таго, высветлілася, што больш шчаслівымі ў шлюбе з'яўляюцца муж і жонка, якія на працягу сну датыкаюцца целамі: з іх задаволенасць адносінамі выказалі 94%. У той час, як сярод пар, якія аддавалі перавагу не датыкацца падчас сну, задаволеных аказалася значна менш — толькі 68%.

### КОРАТКА

Каб прадухіліць трагічныя выпадкі на дарозе, у Мінску плануюць звужаць праезную частку каля нерэгулюемых пешаходных пераходаў.

Следчы камітэт Беларусі прыняў рашэнне аб перадачы крымінальнай справы ў дачыненні да былых службовых асоб Беларускай калійнай кампаніі расійскаму боку.

У дачыненні да былога дырэктара Слуцкага льнозавода распачата крымінальная справа за халатнасць.

Сярэдні кошт 1 кв.м на першасным рынку жылой нерухомай маёмасці Мінска ў сакавіку 2014 года склаў $1690 і павялічыўся ў параўнанні з лютым прыкладна на 2 працэнты. 1 кв.м у аднапакаёвых кватэрах сёлета ў сакавіку ў сярэднім каштуе $1737, у двухпакаёвых — $1676, у кватэрах з трыма і больш пакоямі — $1691. Сярэдні кошт месячнай арэнды жылля ў Мінску без уліку камунальных плацяжоў за аднапакаёвую кватэру складае $371, за двухпакаёвую — $472 і за трохпакаёвую — $506.

## ВЕЛІКОДНЫЯ ЯЙКІ СА СТРАУСАВАГА РАНЧА





**Людміла Сакалоўская (на фота) працуе мастаком-афарміцелем на агракамбінаце «Прыдняпроўскі», але ў вольны час на працягу трох гадоў займаецца размалёўваннем страусавых яек. Матывы на незвычайных сувенірах — на любы густ. Але напярэдадні свята Вялікадня ў наведвальнікаў страусавага ранча попытам карыстаюцца менавіта яйкі са святочным матывам. Спецыяльная алейная фарба дазваляе трымацца ўзорам на працягу доўгага часу і надае прастору для творчасці мастачкі.**

— Гэта справа — для душы, — дзеліцца Людміла Аляксандраўна. — З-за круглай формы страусавае яйка расфарбоўваць значна цяжэй, чым, напрыклад, напісаць карціну.

Размаляванае страусавае яйка — тавар штучны. Яго актыўна разбіраюць і беларусы, і замежныя госці, што наведваюць ранча.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

*Магілёўская вобл.*

# ЖЫЦЬ ПАВОДЛЕ ПРАЎДЫ І ЗАПАВЕДЗЯЎ БОЖЫХ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

З цвёрдым перакананнем і непахіснай верай у гэты напоўнены дабрадатнай сілай выратавальны дзень мы зноў і зноў радасна ўсклікаем:

Хрыстос уваскрэс!

Уваскрэсць Хрыстос — краевугольны камень нашай веры (Эф. 2: 20), у Ім — перамога праўды, перамога дабрадзейнасці, перамога жыцця, перамога бессмяротнасці! Пра свята перамогі жыцця над смерцю ясна гаворыць апостал Павел: *«Бог... уваскрэсіць і нас сілаю Сваёю»* (1 Кар. 6: 14), бо ўсім нам дадзена ўваскрэсенне з мёртвых.

Сэрцы нашы напоўнены сёння радасцю Уваскрэсення Хрыстовага. І кожны можа падзяліцца гэтай радасцю пра Уваскрэслага Госпада нашага Ісуса Хрыста — і з блізкімі, і з далёкімі: навучыцца быць з тымі, хто навокал нас, добрымі і міласэрнымі, сумленнымі і добразычлівымі, здольнымі і гатовымі пайсці з імі на любыя выпрабаванні; сагрэць святлом Божай любові састарэлых, адзінокіх, хворых і тых, хто па нейкіх абставінах пазбаўлены магчымасці падзяліць Пасхальную радасць з тымі, хто ў храме. Такія справы хрысціянскай любові перамяняюць і нас, і навакольны свет.

Жыць паводле праўды і запаведзяў Божых — пад сілу кожнаму шчыра веруючаму чалавеку. Звяртаючыся да нас, Усемагутны Гасподзь заклікае: *«Прыйдзіце да Мяне, усе стружданыя і абцяжараныя, і Я супакою вас. Вазьміце ярмо Маё на сябе і навучыцеся ад Мяне, бо Я лагодны і пакорлівы сэрцам; і знойдзеце спакой душам вашым. Бо ярмо Маё прыемнае, і цяжар Мой лёгкі»* (Мф. 11: 28-30). Спасіцель свету не патрабуе ад нас нічога непасільнага. Міласэрны Гасподзь, любячы Сваё стварэнне, заўсёды з тымі, хто веруе ў Яго, даючы ім моц, сілу і ўсё патрэбнае, каб несці жыццёвы крыж. Успомнім каштоўныя словы, якія Ісус Хрыстос уклаў у сэрцы ўсіх, хто ўвераваў, хто ўзлюбіў Яго, абяцаючы заўсёды быць з імі: *«...і вось, Я з вамі ва ўсе дні да скачэння веку. Амін»* (Мф. 28: 20). Сёння, тут і цяпер гучаць звернутыя асабіста да кожнага з нас гэтыя словы, у якіх і надзея, і суцяшэнне...

Праасвяшчэнныя архіпастыры, узлюбленыя айцы, браты і сёстры, віншуючы ўсіх вас з найвялікшым святам Светлага Хрыстовага Уваскрасення, малітоўна жадаю вам невычэрпнай дабрадатнай дапамогі Божай у далейшым вашым служэнні на славу Святой Праваслаўнай Царквы, дзеля роскіту краіны нашай — Беларусі, на карысць і радасць усім нашым бліжнім і дальнім.

Уваскрэслы Хрыстос Спасіцель няхай умацуе нас у веры і хрысціянскай набожнасці. Дабрадатнае святло гэтай выратавальнай Пасхальнай ночы няхай напаўняе сэрцы нашы любоўю ў Хрысце Уваскрэслым і радасцю яднання з Ім — радасцю чаканага намі бясконцага жыцця вечнага:

Хрыстос уваскрэс!

Сапраўды ўваскрэс Хрыстос!

**Павел,**
**Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі,**
**Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.**




# ПАСХА — АЖЫЎЛЯЛЬНЫ ГЛЫТОК СВЕЖАГА ПАВЕТРА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Пасха — гэта захапленне Богам, які бязмежна любіць чалавека аж да такой ступені, што паслаў свайго адзінароднага Сына на крыжовую смерць, каб яго збавіць. Пасха — гэта гісторыя ўкрыжаванага і ўваскрослага Хрыста, які запэўнівае нас у тым, што Бог не перастае нас любіць нават тады, калі мы Яго прыбіваем да крыжа. Пасха — гэта магчымасць спаткацца з Хрыстом, які прыходзіць да нас, каб запэўніць нас у сваёй любові, якая ратуе перад кожным відам смерці — фізічнай, духоўнай, маральнай, грамадскай і г.д.

Недахоп веры ва Уваскрэсенне Хрыста робіць чалавека бязрадным перад абліччам жыццёвых досведаў. Пустая магіла — гэта не толькі першы знак, які Езус пасылае жанчынам, што прыйшлі намасціць Яго цела, і апосталам, але таксама сімвал палохаючай пустаты, у якую трапляюць людзі, калі сярод іх няма Бога. Без Бога для чалавека ўсё здаецца пустым, бессэнсоўным і жахлівым. Без Бога мы становімся бездапаможнымі і блытаемся, як маленькія, пазбаўленыя любячых бацькоў дзеці. Мы можам вытрымаць кожнае выпрабаванне і цярпенне, калі з намі ёсць Той, хто любіць і вучыць любіць. Гэта ўваскрослы Хрыстус, які заўсёды ёсць з намі ў Святым Пісанні, сакрамэнтах і жыцці Касцёла. Ён з намі, каб мы маглі спазнаць Яго любоў. Ён штодзённа запрашае нас, каб мы былі Яго вучнямі. А быць вучнем Хрыста — азначае любіць па Яго прыкладзе.

Падчас пасхальнай вігіліі вернікі аднаўляюць абяцанні хросту, што мае сваё вельмі вялікае сімвалічнае значэнне. Святы апостал Павел вучыць, што ў сакрамэнце хросту мы былі пагружаны ў таямніцу цярпенняў, смерці і Уваскрэсення Езуса (Рым 6, 1-14). Кажучы іншымі словамі, у сакрамэнце хросту мы былі ўключаны ў пасхальную таямніцу Хрыста, дзякуючы якой Ён ёсць з намі ў радасці і смутку, у хвіліны поспеху і паразаў. Так ёсць, бо, як кажа Апостал народаў, «ужо не я жыву, а жыве ўва мне Хрыстус» (Гал 2, 20), і ўсе, хто ахрысціўся ў Хрыста, у Хрыста апрануліся (Гал 3, 27).

Сапраўды, у сакрамэнце хросту мы разам з Хрыстом паміраем для граху і разам з Ім уваскрасаем для новага жыцця і такім чынам становімся Божымі дзецьмі. Дзякуючы хросту мы атрымліваем новы хрысціянскі стыль жыцця, пакідаем грэх, каб жыць Божым жыццём.

Таму нам неабходна заўсёды ісці на спатканне з уваскрослым Хрыстом, з якога нараджаецца вера. Чалавек павінен адкрыцца на Бога і Яго заўсёды жывое і дзейснае слова (Гбр 4, 12). Жыццё чалавека толькі тады мае сэнс, калі ён з дзіцячым даверам прыходзіць да Бога і ў Яго шукае сілы для таго, каб чыніць дабро і ўдасканальвацца і такім чынам дасягнуць мэту свайго жыцця.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мэтай жа хрысціянскага жыцця ёсць падрыхтоўка да вечнага. І калі чалавек не рыхтуецца да свайго ўваскрашэння, то ён падобны да цягніка, які сышоў з рэек. Што адбываецца з такім цягніком? Ён проста не едзе наперад. Ён напоўнены рознымі таварамі, якія маюць вялікую матэрыяльную каштоўнасць, але не перавозяцца на месца прызначэння.

Ці часам падобнае не адбываецца з намі? Ці пасля завяршэння зямнога жыцця, калі цягнік нашага жыцця ўжо не будзе ісці наперад, мы зможам забраць з сабой у вечнасць нашы матэрыяльныя каштоўнасці і прыемнасці? Не! Чаму ж тады мы так моцна клапоцімся, каб мець велізарныя дамы, нават палацы, дарагія аўтамабілі і іншыя каштоўнасці? Чаму так шмат часу і сродкаў прысвячаем не заўсёды маральным прыемнасцям? Чаму ўзбагачаемся за кошт іншых?

Пасхальная таямніца адчыняе нам дзверы ў вечнасць. Святы апостал Павел кажа, што мы паядноемся з Езусам падабенствам уваскрэсення (Рым 6, 5), і наша жыццё будзе на нябёсах, адкуль мы чакаем Збаўцу Езуса Хрыста, які наша цела перамяніць так, што яно прыпадобніцца да Яго праслаўленага цела (Флп 3, 20-21). Таму перад намі проста казачная перспектыва — быць так перамененымі, каб стаць падобнымі да Езуса.

У сувязі з секулярнымі тэндэнцыямі сучаснасці паўстае пытанне: ці жывём мы як тыя, хто верыць у такую слаўную будучыню? Калі так, то перад намі адкрываецца новая перспектыва, у якой тое, чым мы валодаем, не завалодае намі і мы не станем нявольнікамі рэчаў і граху.

Евангелле распавядае нам, як жанчыны пайшлі да магілы Езуса, каб, паводле габрэйскай традыцыі, намасціць Яго цела духмянасцямі. Яны былі заклапочаны, хто адсуне камень ад уваходу ў магілу (Мк 16, 1-3). Напэўна, яны спадзяваліся, што жаўнеры, якія неслі варту каля яе, зробяць гэта. Але калі прыйшлі на месца, то, здзіўленыя, убачылі адсунуты камень і змаглі ўвайсці ў грабніцу.

Евангелле ўспамінае землятрус, які здарыўся ў той час, і анёл Пана сышоў з неба і адсунуў камень (Мц 28, 2). Гэты землятрус з'яўляецца сімвалам іншага *землятрусу* — а менавіта знакам прысутнасці Бога, знакам новага стварэння, знакам вызваленага з грахоўнага палону чалавека.

Таксама запячатаны магільны камень, які быў знакам зямнога прызначэння Езуса і Яго пахавання сярод памерлых, быў адсунуты Божай моцай, што з'яўляецца новым знакам уваходу вечнасці ў часовасць і перамогі жыцця над смерцю. Уваскрэсенне — новы пачатак, новы дзень, які выконвае жаданні і рэалізуе надзею. Гэта ключ для разумення жыцця і смерці, часу і вечнасці. Слова «Пасха» азначае пераход. Сваім уваскрэсеннем Хрыстус завяршыў апошні пераход ад смерці да жыцця, ад старога свету ў новы свет і новы час збаўлення і Божага Валадарства.

Такім чынам, уваскрэсенне Хрыста з'яўляецца *ажыўляльным глытком свежага паветра* як у нашым асабістым жыцці, так і ў адносінах паміж людзьмі, каб там, дзе дзьме вецер злосці і нянавісці, запанавала згода; дзе пануе варожасць, настаў мір; дзе прыніжэнне — пашана, і г.д. Можа, некаторым здаецца, што гэты *глыток свежага паветра* ў нас саміх, нашых сем'ях, адносінах паміж народамі — не што іншае, як утопія. Аднак пасхальная падзея нагадвае аб тым, што гэта не ўтопія. *Глыток свежага паветра* на самой справе магчымы, бо ўваскрослы Хрыстус з'яўляецца крыніцай надзеі, падобна як святло ў цемры.

Анёл Пана, які знаходзіўся ў пустой грабніцы, сказаў жанчынам: «Не бойцеся! Ведаю, што вы шукаеце Езуса ўкрыжаванага. Яго тут няма, Ён уваскрос, як сказаў. (...) ідзіце хутчэй, скажыце вучням Ягоным, што Ён уваскрос і апярэджвае вас у Галілеі» (Мц 28, 5-7). Потым яны спаткалі самога Езуса, які ім сказаў: «Не бойцеся. Ідзіце, паведаміце братам Маім, каб ішлі ў Галілею, там Мяне ўбачаць» (Мц 28, 10).

Такім чынам жанчыны, што прыйшлі да магілы, сталі *першымі евангелізатарамі*, бо абвясцілі аб найбольш важнай падзеі ў гісторыі чалавецтва — уваскрэсенні Езуса.

Галілея — гэта месца, дзе жылі апосталы. Таму яны не павінны былі чыніць нічога надзвычайнага, каб спаткаць уваскрослага Езуса. Ім неабходна было толькі вярнуцца ў свае дамы, да сваіх заняткаў.

Часта мы пытаемся, дзе можам спаткаць Бога. Велікоднае Евангелле дае адказ: «Там, дзе жывём і працуем, гэта азначае — у нашай Галілеі». Неабходна толькі адчыніць Яму дзверы нашых сэрцаў.

Святкуючы ўрачыстасць Уваскрэсення, мы адначасова вызнаём веру, што Езус ёсць Збаўцам свету і Збаўцам кожнага з нас. Перад абліччам гэтай праўды мы не можам заставацца абыякавымі. Хрыстус не можа заставацца на перыферыі нашага жыцця, бо Ён — яго цэнтр. Вельмі прыгожа кажа псальміст, што «камень, адкінуты будаўнікамі, стаў галавою вугла. Пан учыніў так, і дзіўна гэта ў вачах нашых» (Пс 118 (117), 22-23). Без гэтага каменя не можа быць будынка. Без Хрыста няма збаўлення, і наша жыццё застаецца ў палоне смерці і зла. Без Хрыста чалавецтва знаходзіцца ў вязніцы розных формаў эгаізму, зла, праступкаў, незахавання фундаментальных правоў і свабоды чалавека і цэлых народаў, і г.д.

Як страшна гучаць словы «без Хрыста»! Гэта як быццам надзея на жыццё, справядлівасць і мір няўмольна накіравана на правал. Як быццам не было Уваскрэсення і Езус усё яшчэ знаходзіцца ў магіле. Будучы Папа Бенядыкт XVI, яшчэ як кардынал Ёзаф Ратцынгер, казаў, што Вялікая субота — гэта дзень, калі Езус знаходзіцца ў магіле. Ці гэта не сімптом нашага часу? Ці не з'яўляецца наш час Вялікай суботай і часам без Бога?

Жыццё без Бога і Божага закону; жыццё так, як быццам Бог не існуе; жыццё, не згоднае з маральнымі нормамі; тэрарызм і акты насілля; карупцыя і сацыяльная несправядлівасць; забойства ненароджанага жыцця і амаральнае выкарыстанне дасягненняў генетыкі і многае іншае — гэта не што іншае, як жудасныя знакі адсутнасці Бога ў нашым жыцці і адмовы ад веры ў Яго, якія нараджаюць пагарду і непрыманне іншага чалавека, ігнараванне яго правоў і да т.п. Таму нам неабходна ўчыніць усё магчымае, а перадусім маліцца, каб праўда ўваскрэсення Хрыста стала рэальнасцю нашага жыцця, каб мы Бога не хавалі ў магіле, каб Ён быў у нашых сэрцах і каб мы жылі згодна з Божым законам, бо «Бог — наша прыстанішча і сіла, надзейная дапамога ў нядолі» (Пс 46, 2). Дапамога нам у гэтым — Хрыстус, які сказаў: «Будзьце адважнымі: Я перамог свет» (Ян 16, 33).

Няхай папярэджаннем у гэтым нам будуць словы сучаснага баварскага рэжысёра Аўгуста Эфердзінга пра тое, што хто жэніцца з духам часу, той хутка становіцца ўдаўцом.

Нам, людзям ужо XXI стагоддзя, Бог указвае жыццёвы шлях і запрашае, каб мы ім ішлі, бо толькі тады дойдзем да адпаведнага распазнання праўды Уваскрэсення і паверым у яе. На гэтым шляху нам дапамагае сам Збаўца. Неабходна толькі Яго слухаць, як паслухаў Пётр і выплыў на глыбіню, каб злавіць шмат рыбы, хоць перад гэтым лавіў усю ноч і нічога не злавіў (Лк 5, 4-6).

Святло велікоднай раніцы асвятліла цемру смерці, радасць замяніла смутак, усмешка — цярпенне. Занепакоенасць будучыняй саступіла месца ўпэўненасці і веры ў дзеянне Божай любові.

Таму нашу надзею мы павінны мець не ў людзях ці арганізацыях, але ў Богу. Падчас розных крызісаў грамадскія настроі часта змяняюцца, пра што вельмі добра сведчыць гісторыя Вялікага тыдня. У Пальмавую нядзелю людзі віталі Езуса словамі «Гасанна Сыну Давіда», а ў Вялікую пятніцу патрабавалі Яго ўкрыжавання. Ніякая арганізацыя і нават найбольш дасканалая грамадская сістэма не ўратуе людзей ад крызісу, бо яго прычына ў граху. Таму наша радасць павінна абапірацца не на чалавечы аптымізм, але на праўду ўваскрэсення Хрыста.

Мы павінны прасіць Езуса даць нам удзел у Яго ўваскрэсенні і яго моцай нас так перамяніць, каб мы маглі адчуваць Яго як жывога і дзеючага сярод нас, — як кажа Папа Францішак.

У касцёлах, цэрквах, кірхах і малітоўных дамах сёння гучыць радаснае «Аллелюя!». Узвесялімся і мы! Праславім ўваскрослага Пана радаснымі спевамі ў нашых святынях, актамі любові — у сем'ях і ў нашай Айчыне. Абдымем нашымі малітвамі як веручых, так і няверуючых, бо любоў Божая вылілася на ўсіх людзей. Хрыстус Уваскрос, каб усе мелі доступ да нябеснага Айца. У духу веры падзелімся велікоднай радасцю з усімі.

Складаючы адзін аднаму святочныя зычэнні і дзелячыся традыцыйным велікодным яйкам, сімвалам жыцця, успомнім таксама пра людзей, выключаных з сацыяльнага жыцця, пра зняволеных, адзінокіх, хворых, пажылых, тых, хто працуе ў святочныя дні, каб дазволіць іншым адпачываць. Абдымем іх брацкай любоўю і падзелімся з імі велікодным духоўным супакоем, які прынёс нам уваскрослы Хрыстус. Няхай велікодная радасць зыходзіць з нашых сэрцаў на ўсіх!

Дарагія браты і сёстры, усе людзі добрай волі!

Сардэчна віншую вас з радасным і збаўчым святам Уваскрэсення Хрыста. Сёлета Пасха святкуецца ўсімі хрысціянамі разам. У гэтым мы павінны бачыць знак Божага Провіду, які заклікае аб'яднаць нашы высілкі для сумеснай абароны хрысціянскіх каштоўнасцяў і больш моцнага абвяшчэння Добрай Навіны аб Езусе ўваскрослым.

Таму сёлетняя Пасха — гэта наша супольнае свята, з якім віншую ўсіх хрысціян і людзей добрай волі і зычу моцы Уваскрослага, Яго ласкі і супакою. Няхай у складанай рэчаіснасці сучаснага свету яна сапраўды стане ажыўляльным глытком свежага паветра, які вядзе да новага жыцця ва ўваскрослым Хрысце.

Гэтыя свае пажаданні ўмацоўваю блаславеннем у імя Айца, і Сына, і Духа Святога. Амэн.

**Арцыбіскуп**
**Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ,**
**Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.**

■ Падзея

# НА «ТЭЛЕВЯРШЫНІ» ЗАЗІРНУЛІ Ў БУДУЧЫНЮ




## Удзельнікі цырымоніі спалучалі «Купалінку» і «Суліко», спявалі, стоячы на ружовых табурэтках, і танцавалі ў балетных пачках

**Выбраць лепшых сёлета, як, зрэшты, і ў мінулыя гады, журы дзясятага Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу «Тэлевяршыня» было няпроста: у творчым спаборніцтве ўдзельнічала 238 заявак як ад буйных медыяхолдынгаў, так і ад рэгіянальных тэлекампаній. З іх было адабрана 76 намінантаў — на 25 прызавых месцаў. Усе гэтыя работы выйшлі ў эфір цягам мінулага года і ўжо былі ацэнены гледачамі, цяпер жа атрымалі ацэнкі (дарэчы, вельмі высокія) ад прафесіяналаў. Прынамсі, як адзначыў міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі, большасцю работ іх аўтары могуць заслужана ганарыцца, бо яны выкананы на ўзроўні сусветнага тэлебачання. А сам конкурс, паводле слоў міністра, «падштурхоўвае да развіцця і з'яўляецца пляцоўкай для пошуку талентаў і пашырэння інфармацыйнай прасторы».**

Наогул жа, за 10 гадоў, што існуе «Тэлевяршыня», яе лаўрэатамі і ўладальнікамі адмысловых статуэтак сталі больш як 200 тэлевядучых, рэжысёраў, сцэнарыстаў, аператараў, прадзюсараў — тых спецыялістаў, што робяць сучаснае беларускае тэлебачанне.

Юбілейную цырымонію яе арганізатары — тэлеканал АНТ — вырашылі зрабіць гэткім мостам дружбы, які злучыў сучаснасць і будучыню, сцэну і залу, а таксама самых розных людзей: вядучых цэнтральных і рэгіянальных каналаў, «зорак» экрана і спорту, прафесіяналаў, якія працуюць у кадры і за кадрам. І гэта, трэба сказаць, атрымалася на сто працэнтаў. Атмасфера цырымоніі, насычаная сюрпрызамі і жартамі, была ці не гэткай жа нефармальнай і лёгкай, як на апошнім «Оскары», а ўсе вядучыя абышліся практычна без пафасу, затое з вялікай доляй гумару і самаіроніі. Выйшла суцэльнае вялікае свята — імклівае, насычанае, з абавязковай закручанай інтрыгай, з прыгожымі людзьмі ў шыкоўных уборах, з кранальнымі прамовамі, з захапляльнымі інтэрмедыямі і забаўнымі музычнымі нумарамі.



Сёлета ўзнагароды «Тэлевяршыні» прысуджаліся ў 25-ці намінацыях. Але прызавых статуэтак, у прамым сэнсе каштоўных і важкіх (39-сантыметровая фігурка з бронзы, упрыгожаная штучным дыяментам, важыць 1,5 кг), атрымалася больш. Па-першае, у дзвюх намінацыях — «Лепшая тэматычная праграма» і Гран-пры «Тэлепраект года» — аказалася па 2 пераможцы: «Арсенал» (тэлекампанія «Ваен-ТБ») і «Вяртанне ў Хатынь» (МДТРК «Мір»), а таксама фінальнае шоу конкурсу Miss Supranational-2013» (АНТ) і другі сезон «Спяваючыя гарады» (СТБ) адпаведна. А па-другое, акрамя загадзя вызначаных намінацый, па традыцыі было ўручана некалькі спецыяльных прызоў журы: за сацыяльную праграму «У вас будзе дзіця» (АНТ), дзякуючы якой ужо 45 выхаванцаў дзіцячых дамоў знайшлі новыя сем'і; за стварэнне і арганізацыю працы спартыўнага тэлеканала («Беларусь-5», Белтэлерадыёкампанія) і за ўклад у развіццё айчыннага тэлебачання (Міністэрства сувязі і інфарматызацыі РБ).

Магчыма, адзіным расчараваннем (прынамсі, нашым асабістым) у цырымоніі стала тое, што ніводзін з вядучых і членаў журы не выступіў па-беларуску. Нават з лаўрэатаў адзначыліся ў гэтым плане толькі два чалавекі — вядучы АТН Міхась Равуцкі, які атрымаў прыз за лепшую асветніцкую праграму («Нацыянальная трылогія», Белтэлерадыёкампанія) і лепшая вядучая рэгіянальнага тэлебачання Вераніка Тарасюк (рубрыка «Ваколіца», ТРК «Брэст»).

Адной жа з прыемных нечаканасцяў стала ўпэўненае ўмяшанне ў спрэчку паміж цэнтральнымі «кітамі медыя» рэгіянальных каналаў — у прыватнасці, прадстаўнікі Магілёва і Брэста не толькі склалі годную канкурэнцыю сталічным калегам, але дзе-нідзе і абышлі іх. Так, дакументальны фільм ТРК «Магілёў» «Верасень 1943-га. Недзіцячы дзённік», прысвечаны пачатку вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, прэтэндаваў на перамогу ў 4-х намінацыях, а ў дзвюх стаў першым: «Лепшы праект рэгіянальнага тэлебачання» (гэты прыз вядучыя трапна параўналі з малым хрустальным глобусам «Тэлевяршыні». — **Аўт.**) і «Лепшы рэжысёр». «Падчас работы я для сябе зрабіў некалькі адкрыццяў і пераканаўся, што факты, напісаныя ў падручніках — гэта адна гісторыя; адлюстраваная ў творах мастацкай літаратуры — другая, але лепш за ўсё запамінаецца і ўражвае тая гісторыя, якую расказваюць удзельнікі тых падзей, нашы бабулі і дзядулі, бо яна напоўнена жывымі эмоцыямі, — прызнаўся крыху пазней узрушаны рэжысёр Андрэй Пачалаў. — Разам з творчай групай большасць мінулага лета мы правялі ў акопах і, спадзяюся, змаглі перадаць гледачам той настрой і тыя ўражанні, якія адчувалі ўдзельнікі тых вызваленчых падзей».

Купаліся ў прамянях славы і прадстаўнікі «Ваен-ТБ», якія падышлі да 20-годдзя тэлекампаніі з дзвюма «Тэлевяршынямі» — за лепшую тэматычную праграму і за лепшую сацыяльную рэкламу (маладая каманда зрабіла з прызыўной кампаніі-2013 якасны мініблокбастар!).

Але галоўная барацьба звыкла разгарнулася паміж вядучымі тэлеканаламі краіны. У выніку ў неафіцыйным «медальным рэйтынгу» лідарства захапіў тэлеканал АНТ, у якога 9 узнагарод, далей ідуць Белтэлерадыёкампанія, у якой 7 прызавых статуэтак, і «Сталічнае тэлебачанне» з 5 узнагародамі.

І ўсё ж, нават ведаючы гэты расклад, тэлеверсію цырымоніі, якую пакажа сёння ўвечары АНТ, пaглядзець варта. Дзе яшчэ вы ўбачыце «віруснае відэа» з Саладухам, чаргу на абдымкі з алімпійскімі чэмпіёнамі і эпатажны выхад мужчыны ў спадніцы; пачуеце адначасова «Купалінку» і «Суліко», паслухаеце арыю Містара Ікс у выкананні тэлевядучых і даведаецеся, у каго з вядучых здарылася раздваенне асобы і якія першыя словы гавораць дзеці тэлевізійнікаў?

### Хто яшчэ падняўся на «Тэлевяршыню-2013»?

**Лепшы вядучы публіцыстычнай праграмы** — Вадзім Гігін (ток-шоу «Пазіцыя», АНТ).

**«Лепшы вядучы штодзённай інфармацыйнай праграмы** — Вікторыя Сянкевіч («Панарама», БТРК).

**Лепшы рэпарцёр** — Тэнгіз Думбадзэ («Подых планеты», АНТ)

**Лепшы вядучы забаўляльнай праграмы** — Антон Мартыненка («Хара-Шоу», «На тым жа месцы ў той жа час», СТБ).

**Лепшы вядучы тэматычнай праграмы** — Кацярына Забянько («Цэнтральны рэгіён», СТБ).

**Лепшы сцэнарыст** — Руслан Туркоў («Сімвал Перамогі», БТРК).



**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Надзеі БУЖАН**

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ
**ПЕРВОГО ВЫПУСКА**
Общества с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ»
**(ООО «ДЕКО-ПЛАСТ»)**

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента.**
На белорусском языке:
полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ДЭКА-ПЛАСТ»;
сокращенное – ТАА «ДЭКА-ПЛАСТ».
На русском языке:
полное – Общество с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ»;
сокращенное – ООО «ДЕКО-ПЛАСТ» (далее – эмитент).

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).**
Место нахождения эмитента: Республика Беларусь, 220070, г. Минск, ул. Радиальная, д. 54Б, третий этаж, офис 5.
Телефон/факс: 8 (017) 346 41 37; (e-mail): info@tapas.by.

**3. Основные виды деятельности эмитента.**
Подготовка к продаже недвижимого имущества (код 70110 согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2006).

**4. Номер расчетного счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций, наименование обслуживающего банка.**
Расчетный счет в белорусских рублях № 3012103311016 в ОАО «БПС-Сбербанк» (адрес банка: бульвар имени Мулявина, 6, 220005, г. Минск, Республика Беларусь, БИК 153001369, УНП 100219673).

**5. Наименование периодических печатных изданий, определенных эмитентом для раскрытия информации и сроки таких публикаций.**
Бухгалтерская отчетность эмитента будет публиковаться в газете «Звязда» в срок не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года.
Информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента будет публиковаться в приложении к журналу «Юстиция Беларуси» в срок не позднее двух месяцев с даты принятия соответствующего решения.
Информация о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) будет публиковаться в печатных средствах массовой информации, учрежденных Высшим Хозяйственным Судом Республики Беларусь, в течение пяти дней с момента получения соответствующего судебного постановления.
Информация о внесенных изменениях в Проспект эмиссии будет публиковаться в газете «Звязда» в срок не позднее 7 (Семи) дней с даты государственной регистрации соответствующих изменений в регистрирующем органе.

**6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента.**
Наименование депозитария: Открытое акционерное общество «БПС-Сбербанк» (далее – депозитарий);
Место нахождения депозитария: бульвар имени Мулявина, 6, 220005, г. Минск, Республика Беларусь.
Депозитарий зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28 декабря 1991 г. (Регистрационный №25).
Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам №02200/5200-1246-1086, выдано Министерством финансов Республики Беларусь, действительно по 30 января 2022 года.

**7. Размер уставного фонда эмитента.**
Уставный фонд эмитента 5 560 000 000 (Пять миллиардов пятьсот шестьдесят миллионов) белорусских рублей.

**8. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение.**
Решение о первом выпуске жилищных облигаций (далее – облигации) принято Общим собранием участников эмитента 02 апреля 2014 г. (протокол от 02.04.2014 №2/2).

**9. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций.**

| | |
|---|---|
| Форма выпуска и вид облигаций | Бездокументарные, именные, конвертируемые |
| Объем эмиссии облигаций | 15 250 000 000 (Пятнадцать миллиардов двести пятьдесят миллионов) белорусских рублей |
| Количество облигаций | 2 500 (Две тысячи пятьсот) штук |
| Серия облигаций | ДКП-1 |
| Номера облигаций | 000001-002500 |

**10. Номинальная стоимость облигации.**
Номинальная стоимость одной облигации составляет 6 100 000 (Шесть миллионов сто тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный 1 (Одному) квадратному метру общей площади жилого помещения в жилом доме № 1 в составе объекта «Многоэтажные жилые дома со встроенно-пристроенными объектами торговли, административными помещениями, полузаглубленной и наземной автостоянкой в жилом районе Лебяжий в г. Минске» (далее – жилой дом № 1).

**11. Цель выпуска облигаций и направления использования средств, полученных от размещения облигаций.**
Облигации выпускаются с целью привлечения денежных средств юридических и (или) физических лиц на осуществление строительства жилого дома №1, на финансирование иных мероприятий, связанных со строительством указанного дома, а также на пополнение оборотных средств эмитента. Денежные средства, полученные от размещения облигаций, используются в соответствии с целями их выпуска.

**12. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**
В качестве обеспечения исполнения обязательств эмитента по облигациям выступает поручительство Унитарного предприятия по оказанию услуг «Торговый центр Пассаж» на сумму 15 250 000 000 (Пятнадцать миллиардов двести пятьдесят миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 02.04.2014 №1. Место нахождения поручителя: Республика Беларусь, 220070, г. Минск, ул. Радиальная, 54б, третий этаж, каб. 11.

**13. Период размещения облигаций.**
Дата начала размещения облигаций – 20.04.2014.
Дата окончания размещения облигаций – 20.04.2019.

**14. Место, время и порядок размещения облигаций.**
Проведение открытой продажи облигаций осуществляется эмитентом самостоятельно ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Республика Беларусь, 220070, г. Минск, ул. Радиальная, 54Б, третий этаж, офис 5.
Открытая продажа облигаций осуществляется физическим и (или) юридическим лицам в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем заключения соответствующего договора.
Жилищные облигации имеют право приобретать (как в процессе размещения жилищных облигаций, так и в процессе их обращения) юридические и физические лица, заключившие с эмитентом договор в простой письменной форме, предусматривающий обязательства эмитента по строительству жилых помещений владельцам жилищных облигаций.
Открытая продажа облигаций осуществляется по цене, определяемой эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи жилищных облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг.

**15. Срок обращения облигаций.**
Срок обращения облигаций устанавливается с 20.04.2014 по 20.05.2019 (1856 календарных дней).

**16. Дата начала погашения облигаций.**
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

### ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2012 г. | 3011 | 16 187 552,6 | - | 368 263,0 | 1 584 493,8 | 1 178 417,0 | 19 318 726,4 |
| 1.1 | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей капитала | 3012 | - | - | 443 183,0 | 397 992,6 | 587 952,4 | 1 429 128,0 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 1 201 790,3 | 587 952,4 | 1 789 742,7 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 443 183,0 | (443 183,0) | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | - | - | x | (360 492,0) | x | (360 492,0) |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (360 492,0) | x | (360 492,0) |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 2.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | (122,7) | - | (122,7) |
| 3 | Остаток на 1 января 2013 г. | 3013 | 16 187 552,6 | - | 811 446,0 | 1 982 486,4 | 1 766 369,4 | 20 747 854,4 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2013 г. | 3011 | 16 187 552,6 | - | 811 446,0 | 1 982 486,4 | 1 766 369,4 | 20 747 854,4 |
| 5 | Изменения статей капитала | 3012 | 500 000,0 | - | 240 358,1 | 669 460,8 | 535 972,6 | 1 945 791,5 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 1 401 280,4 | 551 755,7 | 1 953 036,1 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 240 358,1 | (240 358,1) | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | 500 000,0 | - | x | (507 244,6) | x | (7 244,6) |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 500 000,0 | - | x | x | x | 500 000,0 |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (507 244,6) | x | (507 244,6) |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | 15 783,1 | (15 783,1) | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2014 г. | 3013 | 16 687 552,6 | - | 1 051 804,1 | 2 651 947,2 | 2 302 342,0 | 22 693 645,9 |

### СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2013 год | 2012 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | 4.9 | 1 401 280,4 | 1 201 790,3 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | 6 | 551 755,7 | 587 952,4 |
| 2.1 | В том числе: переоценка основных средств | 3012121 | | 546 118,1 | 584 449,2 |
| 2.2 | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | | 5 636,2 | 3 502,4 |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | 1,4 | 0,8 |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | 30121 | | 1 953 036,1 | 1 789 742,7 |

### ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2013 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2013 год | 2012 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 18 813 951,5 | 17 597 827,6 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (14 485 470,6) | (13 340 469,7) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 1 937 467,5 | 1 400 810,1 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (676 562,4) | (453 420,2) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | 2 576,1 | 3 482,4 |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | (13 069,0) | (18 982,2) |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 625 122,8 | 638 026,8 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | - | - |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 228 067,5 | 292 772,8 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (3 751 806,3) | (2 924 478,0) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (103 328,8) | (130 371,7) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого | 701 | | 2 576 948,3 | 3 065 197,9 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | 5 523 617,5 | 2 474 109,1 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (641 114,4) | 1 287 751,8 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (3 335 526,4) | (1 068 997,3) |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (24 327 823,1) | (24 679 346,6) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | 45 902,2 | 38 282,2 |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (1 415 409,6) | 2 694 997,1 |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого | 702 | | (24 150 353,8) | (19 253 203,7) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | (1 841 607,4) | 115 992,9 |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 3 833 100,2 | 1 964 924,0 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 16 144 177,3 | 26 140 710,1 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | 925 127,6 | (2 997 964,7) |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | (29 165,1) | (24 869,7) |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 2 061 963,0 | (4 406 009,4) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого | 703 | | 21 093 595,6 | 20 792 783,2 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | (479 809,9) | 4 604 777,4 |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (432 939,7) | (672 923,0) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 57 737,6 | 2 739,4 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | (309 168,7) | (85 122,0) |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | 100,0 | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | (855 000,0) |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | - | - |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | (684 270,8) | (1 610 305,6) |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | 500 000,0 | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | (507 242,5) | (360 489,5) |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | (7 242,5) | (360 489,5) |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 160 244,1 | 38 485,1 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | (1 011 079,1) | 2 672 467,4 |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 7 | X | 8 001 436,1 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 7 | 6 990 357,0 | X |

**Председатель Правления** **С.П.Писарик**

**Главный бухгалтер** **И.П.Лысоковская**

**«3» марта 2014 г.**

Годовой отчет (бухгалтерский баланс на 01.01.2014, отчет о прибыли и убытках, отчет об изменении капитала, отчет о движении денежных средств за 2013 год) вместе с аудиторским заключением, подтверждающим его достоверность, размещен на сайте **www.belarusbank.by** в разделе Деятельность банка/Бухгалтерская отчетность (по национальным стандартам).

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

## Аудиторское заключение независимой Аудиторской организации ИООО «Эрнст энд Янг» по годовой финансовой отчетности ОАО «АСБ Беларусбанк», подготовленной по итогам деятельности за 2013 год

Г-ну Писарику Сергею Павловичу
Председателю Правления ОАО «АСБ Беларусбанк»

Акционерам, Наблюдательному совету и Правлению ОАО «АСБ Беларусбанк»
Национальному банку Республики Беларусь

Мы провели аудит прилагаемой годовой финансовой отчетности Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее «Банк»).

В соответствии с Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года №507 «Об утверждении Инструкции по составлению годовой финансовой отчетности банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями Республики Беларусь», годовая финансовая отчетность ОАО «АСБ Беларусбанк» состоит из:

- Бухгалтерского баланса Банка на 1 января 2014 года (Форма 1);
- Отчета о прибыли и убытках Банка за 2013 год (Форма 2);
- Отчета об изменении капитала Банка за 2013 год (Форма 3);
- Отчета о движении денежных средств Банка за 2013 год (Форма 4);
- Пояснительной записки.

Указанная годовая финансовая отчетность была подготовлена руководством Банка в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 октября 1994 г, № 3321-XII «О бухгалтерском учете и отчетности», Постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 19 сентября 2005 года №283 «О ведении бухгалтерского учета в банках, расположенных на территории Республики Беларусь» с изменениями и дополнениями, Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года №507 «Об утверждении Инструкции по составлению годовой финансовой отчетности банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями Республики Беларусь» и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки годовой финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде (далее «законодательство Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности»).

***Ответственность руководства за годовую финансовую отчетность***

Руководство Банка несет ответственность за подготовку и представление годовой финансовой отчетности, прилагаемой на 87 листах, в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной годовой финансовой отчетности, не содержащих существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики; определение обоснованных оценочных значений.

***Ответственность Аудиторской организации***

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности годовой финансовой отчетности во всех существенных аспектах в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Годовая финансовая отчетность Банка за 2012 год была проверена другой аудиторской организацией, аудиторское заключение которой датировано 18 марта 2013 года и содержит безусловно положительное мнение о годовой финансовой отчетности за 2012 год.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» от 12 июля 2013 года № 56-З и Правилами аудиторской деятельности, утвержденными Министерством финансов Республики Беларусь. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в годовой финансовой отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытие информации в годовой финансовой отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения годовой финансовой отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения годовой финансовой отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля Банка с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а не для выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы. Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления годовой финансовой отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

***Мнение***

По нашему мнению, годовая финансовая отчетность достоверно, во всех существенных аспектах, отражает финансовое положение Банка по состоянию на 1 января 2014 года, результаты его финансово-хозяйственной деятельности и движение денежных средств за год по указанную дату в соответствии с Законом Республики Беларусь от 18 октября 1994 года № 3321-XII «О бухгалтерском учете и отчетности», Постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь от 19 сентября 2005 года №283 «О ведении бухгалтерского учета в банках, расположенных на территории Республики Беларусь» с изменениями и дополнениями, Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года №507 «Об утверждении Инструкции по составлению годовой финансовой отчетности банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями Республики Беларусь», и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде.

**Поясняющий пункт**

Годовая финансовая отчетность не имеет своей целью представление финансового положения и результатов деятельности в соответствии с принципами или методами бухгалтерского учета, общепринятыми в странах, помимо Республики Беларусь. Соответственно, годовая финансовая отчетность не предназначена для лиц, не знакомых с принципами, процедурами и методами бухгалтерского учета, принятыми в Республике Беларусь.

Мы проводили аудит соответствия годовой финансовой отчетности Банка требованиям Национальных стандартов финансовой отчетности только в части положений, регламентирующих представление и раскрытие информации в годовой финансовой отчетности.

| | |
|---|---|
| Лащенко Павел Анатольевич Директор | Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0000738 от 14 мая 2003 года, без ограничения срока действия. Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 8 от 27 октября 2004 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 26 октября 2011 года). |
| Житомирская Оксана Геннадьевна Заместитель директора, аудитор | Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0001790 от 6 июля 2007 года, без ограничения срока действия. Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 35 от 12 сентября 2007 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 16 июля 2013 года). |
| Грушевич Олег Владимирович Начальник отдела консультирования в области бухгалтерского учета, аудитор | Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0001794 от 26 февраля 2010 года, без ограничения срока действия. Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 52 от 7 сентября 2010 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования 29 августа 2013 года). |

Дата аудиторского заключения: 20 марта 2014 года.

Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь.

Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 20 марта 2014 года.

Председатель Правления ОАО «АСБ Беларусбанк» С.П. Писарик

Директор ИООО «Эрнст энд Янг» П.А.Лащенко

# СВЯТОЕ ВЯЛІЧКА — З КРАСНЫМ ЯЙЧКАМ



**Па гарызанталі: 1.** Вясновы дзень ... корміць (прык.). **3.** Лясная птушка; лічылася, што першы раз ... падае голас на Вялікдзень. **9.** Паўзун; верылі, што ... не ўкусіць, калі на першы дзень Вялікадня есці ўсё асвячонае. **10.** Умеламу пчаляру і ... верыць (прык.). **11.** Адна з назваў валачобнікаў, якія на Вялікдзень абыходзілі двары і ўслаўлялі жыхароў. **12.** Гушчу паеў, а юшку на ... (прык.). **14.** Знішчальны агонь; лічылі, калі кінуць вялікоднае яйка ў ..., то ён патухне. **15.** Дзіцячая гульня ў даганялкі. **19.** Музычны інструмент з трыснягу або з дрэва. **20.** «Два святы на свеце — ад нівы да нівы:\\Хрыстос уваскрос! Наступае ...». З верша Я. Купалы «Вялікдзень». **21.** Вялікая хустка. **22.** Кантрольны лісток на атрыманне чаго-небудзь. **24.** Музычны смычковы інструмент. **25.** «Казаў анёлам гасподзь магутны:\\Гэй, дайце ў ... сярод нябёс,\\Што беларускі народ пакутны\\ Уваскрос! «Хрыстос уваскрос!». З верша З. Бядулі «На Вялікдзень». **28.** Паэт і музыкант, выканаўца ўласных песень. **32.** Веснавое свята памінання памерлых; у гэты дзень на могілках «частавалі» нябожчыкаў рэшткамі асвячоных на Вялікдзень страў. **33.** Часціца, якая служыць для супрацьпастаўлення. **34.** Гімнастычны снарад. **35.** Агароджа. **36.** ... дажджы ў красавіку ды адзін у траўні тысячы дажджоў каштуюць (прык.).

**Па вертыкалі: 1.** Дабрадушна-жартлівыя адносіны да чаго-небудзь. **3.** «Пасхальнае ...». Апавяданне В. Быкава. **4.** Будыйскі манах. **5.** Народная гульня; вадзіць ... пачыналі на Беларусі звычайна з Вялікадня. **6.** У красавіку дождж праходзіць, ... грэе — тады ўсякі не збяднее (прык.). **7.** Адна з народных назваў Вялікадня. **8.** Па капельцы — ..., па травінцы — стог (прык.). **13.** «Бо і заможны і ўбогі\\Святы Вялікаднік святкуюць\\І ... у сэрцы сваім чуюць». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Вялікдзень»). **16.** Часопіс для дзяцей. **17.** Яйка, якое пасля гульні ў «біткі» заставалася цэлым. **18.** Быў пост, будзе і ...! Была журба, будзе і радасць (прык.). **21.** «... ў лес, здароўе ў косці»; пажаданне таму, каго на Вербную нядзелю сцябалі галінкамі вярбы. **23.** Хрыстова ... ўсім на вяселле (прык.). **26.** Тонкая празрыстая матэрыя. **27.** Страфа з дзевяці радкоў. **29.** Чужая ... — сіраце паска (прык.). **30.** Падкі да чаго-небудзь. **31.** «Хрыстос уваскрос!- і ўваскрасае\\... , што смутнаю была». З верша Р. Барадуліна «Евангелле ад мамы».

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, г. Дзяржынск.**

**ПРАВЕРЦЕ. КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** 1. Год. 3. Зязюля. 9. Змяя. 10. Рой. 11. Лалоўнікі. 12. Гурт. 14. Пажар. 15. Квач. 19. Дудка. 20. Вясна. 21. Хуста. 22. Талон. 24. Альт. 25. Званы. 28. Бард. 32. Радаўніца. 33. Але. 34. Брус. 35. Паркан. 36. Тры.

**Па вертыкалі:** 1. Гумар. 3. Яечка. 4. Лама. 5. Карагод. 6. Сонца. 7. Вялічка. 8. Мора. 13. Радасць. 16. «Вясёлка». 17. «Мацак». 18. Свята. 21. Хвароба. 23. Нядзеля. 26. Вуаль. 27. Нона. 29. Ласка. 30. Хціві. 31. Душа.

## Даты. Падзеі. Людзі

**1447** год — у пісьмовых крыніцах упершыню згадваюцца Радашковічы (з нагоды заснавання віленскім кашталянам Пятром Гедыгольдавічам касцёла святой Тройцы). У далейшым населены пункт быў прыватнаўласніцкім горадам і належаў князю Вярэйскаму, Гаштольдам, каралеве Боне Сфорцы, Агінскім, Радзівілам. Паводле інвентара 1549 года, у Радашковічах знаходзіўся драўляны замак. У XVI ст. Радашковічы лічыліся каралеўскім уладаннем, пазней належалі Глябовічам, Агінскім, Масальскм, Радзівілам.



**1954** год — 60 гадоў таму нарадзіўся (вёска Лоша Астравецкага раёна) Уладзімір Міхайлавіч Пырачкін, беларускі вучоны ў галіне лячэння хвароб сэрца і сасудаў, доктар медыцынскіх навук. Аўтар навуковых прац па ультрагукавой дыягностыцы і лячэнні сардэчна-сасудзістых захворванняў.

**1970** год — на Волжскім аўтамабільным заводзе сабраны першы аўтамабіль «ВАЗ-2101 «Жыгулі». З гэтага, па сутнасці, пачалася сапраўды масавая аўтамабілізацыя Савецкага Саюза. Пры яго распрацоўцы за аснову быў узяты італьянскі FIAT-124. Родапачальнік усёй «вазаўскай» «класікі» вызначаўся больш дасканалым рухавіком, зmененай трансмісіяй і хадавой часткай. У 1972 годзе на базе 01-й была створана грузавая мадэль «ВАЗ 2102-універсал». З тых часоў «капеечка» і «двоечка» надоўга сталі любімымі машынамі ў СССР. Усяго АўтаВАЗ выпусціў каля чатырох мільёнаў «адзінак», якія ўчынілі сапраўдны пераварот у лакафарбавай, гуматэхнічнай і іншых галінах прамысловасці, якія працавалі на аўтапрам.

### Было сказана

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, пісьменнік:**

*«Лепей няверныя перакананні, чым зусім без іх».*

### НАРОДЖАНЫЯ 19 красавіка

**Гэта дзень строгага кантролю, і людзі гэтага дня імкнуцца трымаць пад кантролем усіх і ўсё. Найвышэйшае задавальненне прыносіць ім кар'ера, стабільнасць у сям'і, упарадкаваны стан жыцця; яны шчаслівыя, калі ім прадастаўляецца магчымасць удасканаліць чужы твор; яны імкнуцца да вялікіх ідэй і асоб. Ім не трэба баяцца змены абставін. Абавязковая ўмова для іх руху наперад — уменне процістаяць жаданню кантраляваць любую жыццёвую сітуацыю, у якую яны трапляюць ці ўмешваюцца. Ім іншы раз карысна адысці ўбок і дазволіць іншым прымаць самастойныя рашэнні.**

### НАРОДЖАНЫЯ 20 красавіка

**У іх высока развітыя якасці лідара. Яны рэдка задавальняюцца асабістымі дасягненнямі, таму што іх прыярытэтам з'яўляецца групавая зацікаўленасць. У іх багаты ўнутраны свет, яны адчувальныя і ранімыя. З задавальненнем аддаюцца летуценнасці, не пазбягаюць пры гэтым праблем і канфліктаў, таму што не створаны для лёгкага і бесклапотнага жыцця. Валодаюць бліскучай інтуіцыяй, але застаюцца зямнымі людзьмі, якім неабходныя добрыя чалавечыя адносіны. Уменне аб'ектыўна ацэньваць свае магчымасці, рэгулярна кантраляваць сябе і праяўляць гнуткасць у падыходзе да жыцця заўсёды дапамагае ім на шляху да поспехаў.**

### Добрая навіна! Шчырых стала болей!

*…Дамоў, у гнёзды буслы злятаюцца,*
*На белых крылах вясну прыносяць!*
*А з ёю — дзетак, тым, хто стараецца,*
*І шчыра ў Бога пра гэта просіць.*

Шаноўнага калегу, **Тараса ШЧЫРАГА** шчыра віншуем з нараджэннем дачушкі! Хай расце здаровенькай! На радасць бацькам і... буслам.

**Звяздоўцы.**



## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Будзеце здольныя на якасны рывок на працы. Было б таксама правільным заняцца сваім здароўем. У аўторак найбольш спрыяльны час для звароту па дапамогу да ўплывовага заступніка. Пачынаючы з чацвярга, паспрабуйце зменшыць працоўную нагрузку да мінімуму.

**ЦЯЛЕЦ.** Неабходна стаць сабранымі і мэтанакіраванымі, бо настае важны перыяд, які дазволіць раскрыць свае здольнасці ў прафесійным плане. Паспрабуйце засяродзіцца на галоўным і не марнаваць сілы па дробязях. Пазбягайце канфліктаў і непаразуменняў з начальствам. Ваша недаверлівасць цяпер не самы лепшы дарадца, забудзьцеся на яе і шукайце спосаб здабыць душэўны спакой.

**БЛІЗНЯТЫ.** У першую палову тыдня пажадана пачаць планамерную рэалізацыю хаця б часткі сваіх ідэй. Ваш пазітыўны настрой на зносіны дазволіць аднавіць страчаныя сувязі, набыць новыя знаёмствы і даведацца шмат карыснага.

**РАК.** Падзеі будуць досыць супярэчлівыя, таму спатрэбяцца намаганні і мудрасць для кіравання сітуацыяй, якая стварылася. Варта сцерагчыся захаплення рызыкоўнымі гульнямі, пазбягаць сумнеўных дагавароў і не рабіць неабдуманых пазык. Фінансавыя праблемы з прычыны буйных страт вельмі верагодныя і могуць прывесці да фінансавага краху.

**ЛЕЎ.** Суцішце свае амбіцыі, і зможаце дасягнуць небывалых поспехаў у справах, а простыя рашэнні дазволяць дамагчыся матэрыяльнага поспеху. Паспрабуйце пазбавіцца ад негатыўных думак пра людзей і сітуацыі, будзьце дабрэйшымі і больш цярплівымі ў адносінах.

**ДЗЕВА.** Можаце атрымаць жаданае, калі здолееце дыпламатычна і своечасова адысці ў цень і адтуль кіраваць падзеямі, якія вас цікавяць. Акалічнасці дадуць магчымасць праверыць партнёраў на надзейнасць у некаторых фінансавых пытаннях. Да канца тыдня пажадана ўшчыльную заняцца асабістымі справамі ці дазволіць сабе адправіцца ў адпачынак.

**ШАЛІ.** Верагодныя перапады настрою, якія будуць не толькі інтрыгаваць навакольных, але і стомяць тых, хто будзе доўга знаходзіцца побач з вамі. Пятніца будзе добрым днём для зносін з сябрамі, а дом пацешыць сваёй утульнасцю і камфортам. У выхадныя адпраўляйцеся з каханым чалавекам у вандроўку.

**СКАРПІЁН.** Чэрпайце бадзёрасць у поспехах і паспрабуйце не прымаць паспешлівых рашэнняў. У панядзелак непажадана пачынаць нават самыя малаважныя справы, лепш працягнуць завяршэнне раней пачатага. У аўторак могуць узнікнуць напружаныя адносіны ў дзелавой сферы, калі з аднаго боку давядзецца асцерагацца падману, а з другога — канфліктаў з начальствам і калегамі.

**СТРАЛЕЦ.** Ваша здольнасць да філасофскіх разважанняў і ўменне рабіць у выніку гэтага рэалістычныя высновы дазволяць выбраць дакладны кірунак і сабрацца з сіламі для чарговага рыўка. У аўторак абавязкова звярніце ўвагу на парады, якімі вас будуць адорваць навакольныя людзі, сярод іх можа апынуцца ў літаральным сэнсе залатая ідэя. Не варта занадта захапляцца абаронай інтарэсаў іншых людзей, бо справы на працы будуць назапашвацца з неймавернай хуткасцю і запатрабуюць ад вас неадкладнага вырашэння.

**КАЗЯРОГ.** Пажадана праявіць актыўнасць і ініцыятыўнасць, гэта паспрыяе як вашай паспяховасці ў цэлым, так і завязванню карысных знаёмстваў і наладжванню сяброўскіх кантактаў у прыватнасці. У чацвер у стасунках з навакольнымі паспрабуйце не казаць лішняга, праявіце вытрымку і спакой, не чапляйцеся да чужых недахопаў і не лезьце з парадамі, калі вас пра гэта не просяць. Пажадана сабрацца з сіламі і давесці да канца пачатую справа, нават нягледзячы на яе ўяўную працаёмкасць.

**ВАДАЛЕЙ.** На пачатку тыдня з ідэямі і прапановамі лепш не выступаць, вылучыцца такім чынам не атрымаецца, вас могуць няправільна зразумець, таму не стварайце сабе лішніх праблем. Да канца тыдня дзеці могуць выказаць свае прэтэнзіі, і чым старэйшыя дзеці, тым больш у іх будзе прэтэнзій. Гэта вымусіць вас перагледзець некаторыя свае прынцыпы і трохі змяніць успрыманне рэчаіснасці. Але ўжо пасля суботы вы адчуеце, як вялікая частка клопатаў звалілася з плячэй.

**РЫБЫ.** Будзе шанцаваць і ў гульні, і ў каханні. Але гульню лепш выбіраць не рызыкоўную, а акцёрскую, тут вы будзеце захапляльныя і можаце дазволіць сабе самыя вар'яцкія выхадкі, усе яны будуць асуджаны на поспех. У канцы тыдня верагодная ўдалая паездка ці плённая сустрэча ў нефармальных абставінах, а блізкія людзі прынясуць радасць.

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

### ГАТУЕМ НА ВЯЛІКДЗЕНЬ

## Пекінская мазаіка

**Спатрэбіцца:** *1 качан пекінскай капусты, 3–4 рознакаляровыя салодкія перцы, 2 плаўленыя сметанковыя сыркі, 200 г брынзы, 2 ст. л. смятаны, 1 бляшанка маслін без костачак, 2–3 зубкі часнаку.*

Надзерці або проста расцерці сметанковы сыр, брынзу, здробнены часнок; дадаць смятану. Змяшаць. Перцы парэзаць невялікімі кубікамі, аліўкі — кружочкамі. Дадаць у сырную масу і змяшаць.

Капусту разрэзаць уздоўж на дзве палавінкі. Асцярожна прамазаць кожны лісцік тонкім слоем начынкі. Сярэдзіну можна выняць, а можна, прыбраўшы лішнія лісточкі і храпку, прыляпіць на месца. Тое ж самае зрабіць з другой палавінкай. Дзве часткі капусты аб'яднаць у адно цэлае і туга заматаць у харчовую плёнку. Качан адправіць у халадзільнік мінімум на 2 гадзіны. Перад падачай на стол парэзаць на парцыённыя кавалкі, апырскаць сокам лімона.





## Кошыкі для салаты

Замешваем цеста для бліноў па любімым рэцэпце. Выпякаем тоненькія невялікія бліны, чым танчэйшыя — тым лепш.

Цяпер самае цікавае — робім кошыкі. Для гэтага трэба перакуліць звычайную шклянку, пакласці на яе блінец і паставіць у мікрахвалёўку секундаў на 20 або 30, а можа, і пабольш, у залежнасці ад вашай печкі. Вось і ўвесь сакрэт.

Пачакаем, пакуль астыне, і здымаем наш кошычак. Кошык атрымліваецца як вафельны сухарык, вось таму і важна іх рабіць тоненькімі, лягчэй есці потым.

Асцярожна — не ператрымайце ў мікрахвалёўцы, а то могуць падгарэць. Такія блінцы можна прыгатаваць загадзя. Без цукру (калі вырашылі падаваць салатную закуску), або салодкія — да дэсерту. А запоўніць у апошнюю хвіліну перад падачай на стол.





## Торт «Яйка Фабержэ»

**Спатрэбіцца:** *1 кг пясочнага пячэння; 1,5 шклянкі ачышчаных грэцкіх арэхаў; 1 бляшанка згушчанага малака; пачак сметанковага масла; 200 г белага шакаладу; 2 шклянкі вяршкоў (33%) або смятаны; 600 г тварагу; 1,5 шклянкі цукровай пудры; жоўты і блакітны харчовыя фарбавальнікі; кандытарскія ўпрыгажэнні для торта (кветачкі і пацеркі).*

Пячэнне добра раскрышыце. Можна рукамі, а можна патаўчы. Здрабніце арэхі. Добра разатрыце сметанковае масла. Да яго патроху дадайце згушчанае малако і шакалад, растоплены на вадзяной лазні. Усё старанна ўзбіце. Атрыманы крэм пастаўце ў халадзільнік на 1 гадзіну.



Старанна змяшайце пакрышанае пячэнне і арэхі. Патроху дадавайце ў гэтую масу ахаладжаны крэм і ўсё зноў старанна змяшайце. Крэму дадавайце столькі, каб маса атрымалася мяккай. З яе трэба зляпіць вялікае яйка і паставіць у халадзільнік на 1 гадзіну.

Робім блакітны крэм. Для гэтага ўзбіце вяршкі з цукровай пудрай, каб атрымалася маса па кансістэнцыі як сметанковае масла. Асобна разатрыце тварог. Спалучыце гэтыя дзве масы. 1/4 частку крэму адкладзіце ўбок. А да астатніх дадайце блакітны фарбавальнік і ўзбівайце, пакуль колер крэму не стане раўнамерным. Прыбярыце крэм у халадзільнік на 40 хвілін.

У крэм, які застаўся, дадайце жоўты фарбавальнік, змяшайце і таксама прыбярыце на 40 хвілін у халадзільнік.

Дастаньце торт-яйка з халадзільніка і пакрыйце яго блакітным крэмам. Раўняйце крэм з дапамогай ліста кандытарскай паперы.

Нам засталося толькі ўпрыгожыць торт жоўтым крэмам з дапамогай кандытарскага шпрыца і кандытарскімі пацеркамі і кветачкамі. Наогул, імправізуйце, як можаце.

## Сакрэты цеста

✓ Пры замесе дражджавога цеста ўсе прадукты павінны быць цёплымі або пакаёвай тэмпературы, бо тыя, якія толькі што дасталі з халадзільніка, запавольваюць пад'ём цеста.

✓ Калі вы абмінаеце цеста, рукі павінны быць сухія.

✓ У цеста (дражджавое і прэсна-здобнае) лепш за ўсё дадаваць нерастопленае сметанковае масла, бо растопленае масла пагаршае структуру цеста.

✓ Дрожджы для цеста павінны быць свежымі, з прыемным спіртавым пахам. Праверце дрожджы загадзя. Для гэтага прыгатуйце невялікую порцыю рошчыны і пасыпце пластом мукі. Калі праз 30 мін. не з'явяцца расколіны, то якасць дражджэй дрэнная.

## ■ Помніць. Шанаваць. Ганарыцца

# БЫВАЙЦЕ ЗДАРОВЫ!

У верасні—кастрычніку 1943 года пачалося вызваленне тэрыторыі Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў. Партызаны ўзмацнілі баявыя дзеянні і адначасова ратавалі мірнае насельніцтва ад карнікаў, рыхтаваліся да сустрэчы з воінамі Чырвонай Арміі.

У гэты час узнік тэкставы варыянт папулярнай песні «Бывайце здаровы!». Створаная Адамам Русаком і Ісакам Любанам у сярэдзіне 1930-х гадоў, яна адразу фалькларызавалася. А пасля перакладу з беларускай мовы Міхаілам Ісакоўскім яна стала народнай песняй і ў расіян.

Любімай мелодыяй віталі чырвонаармейцаў на беларускай зямлі і натхнёнымі словамі благаслаўлялі іх на хуткую перамогу.

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**

*Бывайце здаровы,*
*Жывіце багата*
*І нашу ад сэрца*
*Прыміце параду:*

*У вашым палку каб*
*Героем быў кожны,*
*І хай камандзір ваш*
*Герой будзе двойчы.*

*Каб снайперы збілі*
*Паболей бы фрыцаў,*
*На кожнага было б*
*Штук гэтак па трыццаць.*

*Калі ж не па трыццаць,*
*А болей іх будзе, —*
*Ніхто не спытае,*
*Ніхто не асудзіць.*

*Каб наша пяхота*
*І танкаў лавіны*
*Пакінулі б немцам*
*Зямлі тры аршыны.*

*Каб вы разграмілі*
*Усю стаю шакаллю,*
*Каб кожны баец ваш*
*Хадзіў хоць з медаллю.*

*Калі ж баец кожны*
*І з ордэнам будзе, —*
*Усе прывітаюць,*
*Ніхто не асудзіць.*




*Бывайце здаровы,*
*Багата жывіце,*
*Паганых фашыстаў*
*На захад ганіце.*

*Ганіце фашыстаў*
*На захад смялей вы,*
*Каб жыць багацей нам,*
*Каб жыць весялей нам.*

*Бывайце ж здаровы,*
*Жывіце багата,*
*А мы вас чакаем*
*Дадому, дахаты.* 1943 г.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 6.00 | 20.18 | 14.18 |
| Віцебск | — 5.47 | 20.11 | 14.24 |
| Магілёў | — 5.50 | 20.08 | 14.18 |
| Гомель | — 5.51 | 20.01 | 14.10 |
| Гродна | — 6.16 | 20.33 | 14.17 |
| Брэст | — 6.20 | 20.30 | 14.10 |

### Месяц

***Апошняя квадра 22 красавіка. Месяц у сузор'і Стральца.***

### Імяніны

***Пр.** Івана, Паўла, Пятра, Якава.*
***К.** Эмы, Адольфа, Лявона.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

ВАРШАВА +17..+19°С
ВІЛЬНЮС +18..+20°С
КІЕЎ +15..+17°С
МАСКВА +15..+17°С
РЫГА +16..+18°С
С.-ПЕЦЯРБУРГ +11..+13°С

## УСМІХНЕМСЯ

Купіла сабе завушніцы ў выглядзе камароў, смешныя такія!

За паўдня ўжо пяць разоў ад сяброў па вушах атрымала...

**Школьнік у аптэцы:**

**— У вас ёсць які-небудзь абязбольваючы сродак?**

**— А што ў цябе баліць?**

**— Пакуль нічога, але тата пайшоў на бацькоўскі сход...**

Здаць экзамен па ваджэнні ў ДАІ — гэта дробязь, а вось здаць экзамен па ваджэнні мужу, каб ён дазволіў браць машыну — гэта праблема!

**— Паедзем да мяне?**

**— Не.**

**— Хачу сказаць, што німфаманка вы так сабе.**




caricatura.ru

**ЗВЯЗДА** БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь**

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.**

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС**: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**ТЭЛЕФОНЫ**: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

**http://www.zviazda.by;**
**e-mail: info@zvyazda.minsk.by,**
**(для зваротаў):** zvarot@zvyazda.minsk.by

**ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ** **тэл./факс: 287 17 79,** *e-mail: reklama@zviazda.by*

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 21.637. Індэкс 63850. Зак. № 1564.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 18 красавіка 2014 года.